## 1 чэрвеня 2025 г. - 60 гадоў з часу стварэння Адкрытага акцыянернага таварыства «Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат» (1965)



Адкрытае акцыянернае таварыства «Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат» - адно са старэйшых будаўнічых прадпрыемстваў раёна. Сваю працоўную біяграфію пачало з 1 чэрвеня 1965 года як Кобрынскі завод жалеза-бятонных вырабаў (загад па Брэсцкім Аблміжкалгасбуду № 137 ад 10.06.1965).

Прадпрыемства неаднаразова змяняла сваю назву, але не змяняла свайму прызначэнню. 29 снежня 1973 года Кобрынскі завод ЖБВ перайменаваны ў Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат Брэсцкага Аблміжкалгасбуда, у 1986 годзе – у Кобрынскі міжгаспадарчы СБК. У 1996 годзе перайменаваны ў сельскі будаўнічы камбінат (загад № 11/1-п Брэсцкага Аблсельбуда ад 10.01.1996). З 29 верасня 2000 года Кобрынскі СБК перайменаваны ў Рэспубліканскае ўнітарнае вытворчае прадпрыемства (РУВП) «Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат», з 20 лютага 2003 года – у Дзяржаўнае ўнітарнае будаўнічае прадпрыемства «Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат». У 2004 годзе на падставе загада № 208 ад 28 верасня «Брэстаблмаёмасць» прадпрыемства перайменавана ў ААТ «Кобрынскі СБК».

На шляху свайго развіцця Кобрынскі СБК перажываў розныя этапы, у тым ліку – не самыя простыя. Аднак праблемы ўдалося пераадолець – сёння прадпрыемства працуе стабільна. Будаўніцтва - найважнейшы напрамак у дзейнасці Кобрынскага СБК. Асноўнымі відамі дзейнасці з'яўляюцца вытворчасць і мантаж зборных жалезабетонных канструкцый, выкананне будаўніча-мантажных работ. Прадпрыемства спецыялізуецца на будаўніцтве аб'ектаў сельскагаспадарчага прызначэння.

Для забеспячэння поўнага цыкла ўзвядзення аб'ектаў створана два участкі: агульнабудаўнічы і мантажны. Пры вырабе прадукцыі выкарыстоўваецца арматурны каркас, які апускаецца ў бетонную сумесь, што прыводзіць да павелічэння тэрміна эксплуатацыі матэрыялаў. Канструкцыі добра падыходзяць для будаўніцтва жывёлагадоўчых комплексаў, агрэсіўнае асяроддзе якіх хутка прыводзіць у

непрыдатнасць іншыя матэрыялы. Комплексы з жалезабетону пры належным доглядзе могуць эксплуатавацца да 100 гадоў.

Вытворчая база арганізацыі прадстаўлена вялікім арсеналам будаўнічай тэхнікі: гэта краны, пагрузчыкі, экскаватары, аўтабетона-змяшальнікі. Сёння вынікі дзейнасці камбіната ўпэўнена дэманструюць, што шматфункцыянальнасць, якая аб'ядноўвае дзве ўзаемадапаўняльныя вытворчасці, мае высокую ступень эфектыўнасці.

Геаграфія будаўніцтва Кобрынскага СБК даволі шырокая - будаўнічыя брыгады прадпрыемства ўзводзяць аб'екты па ўсёй тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. У ліку найбольш буйных і значных аб'ектаў, пабудаваных з удзелам Кобрынскага СБК - птушкафабрыка ў Прыбарава (Брэсцкі раён), свінагадоўчы комплекс ЗТАА «Белдан» (Ляхавіцкі раён). Сіламі спецыялістаў Кобрынскага СБК ствараліся такія махіны, як малочнатаварныя фермы ў гаспадарках ААТ «Савушкін прадукт», разлічаныя на 1100-1400 галоў, буйныя малочнатаварныя фермы ў вёсках Легаты, Кісялёўцы, Старадубцы Кобрынскага раёна, птушнікі ў в. Снітава Іванаўскага раёна, на сённяшні дзень будаўнічыя работы вядуцца на малочнатаварных фермах у в. Уласаўцы Іванаўскага раёна. Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат паспяхова спраўляецца заказамі і ў жыллёвым сектары будаўніцтва. Брыгада агульнабудаўнічых работ займаецца будаўніцтвам жылых дамоў, у тым ліку дамоў у вёсках.

Аснова любога будаўніча-прамысловага комплексу – гэта ў першую чаргу людзі. Не забытыя ў СБК тыя, хто стаяў ля вытокаў вытворчасці. Гэта кавалер ордэна Працоўнай Славы 3-й ступені Лідзія Еўчук, ветэраны Аляксандр Нічыпорчык, Ганна Клімавіч, Ганна Паўловіч, Ніна Лапата, якія ў свой час выпусцілі першы куб жалезабетону ў чэрвені 1965-га. Сваёй працай на працягу дзесяцігоддзяў гэтыя людзі стваралі добрае імя завода, фарміравалі яго імідж як надзейнага вытворца якасных канструкцый. Іх імёны залатымі літарамі ўпісаны ў гісторыю прадпрыемства.

З ліпеня 2016 года Кобрынскім СБК упэўнена кіруе дырэктар Сяргей Мікалаевіч Бунь. На сённяшні дзень на прадпрыемстве працуе 218 чалавек – прадстаўнікі самых розных спецыяльнасцей – ад мантажнікаў і кранаўшчыкоў да інжынераў і эканамістаў. Калектыў аператыўна і якасна выконвае сваю працу. Дасягнуць гэтага атрымалася ў першую чаргу дзякуючы самаадданай рабоце ўсяго калектыву. Работы

выконваюцца вопытнымі майстрамі і спецыялістамі, якія маюць дастойны стаж і не раз сутыкаліся з заказамі рознай складанасці.

Сярод ветэранаў Кобрынскага СБК ёсць супрацоўнікі, якія прапрацавалі на прадпрыемстве больш за 35 гадоў: Васілій Рыгоравіч Дземідзюк, Міхаіл Анатольевіч Калач, Васілій Васільевіч Мішчук, Анатолій Міхайлавіч Пукач, Сяргей Яўгеньевіч Хількевіч і многія іншыя. Іх веды і вопыт - надзейны фундамент, на якім будуецца прафесіяналізм калектыву.

Вынікі працоўнага калектыву неаднаразова адзначаліся ўзнагародамі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Рэспублікі Беларусь і Рэспубліканскага Саюза Будаўнікоў, дыпломамі і граматамі ДА «Брэстаблсельбуд» за лепшыя дасягненні ў вытворчай дзейнасці сярод арганізацый, якія ўваходзяць у склад аб'яднання, а таксама рэспубліканскім камітэтам Беларускага прафесійнага саюза работнікаў аграпрамысловага комплексу.

ААТ «Кобрынскі СБК» уваходзіць у склад адной з найбуйнейшых будаўнічых кампаній вобласці - аб'яднання «Брэстаблсельбуд», тым не менш лічыцца самадастатковым - самастойна вызначае перспектывы развіцця і плануе напрамак дзейнасці. Прадпрыемства з'яўляецца манапалістам, лідэрам у Брэсцкай вобласці па будаўніцтву будынкаў і збудаванняў з рамных жалезабетонных канструкцый. Вызначыўшы галоўным напрамкам сваёй дзейнасці выпуск прадукцыі для сельскагаспадарчага будаўніцтва, прадпрыемства ўжо 60 гадоў ідзе па гэтым шляху, пастаянна ўдасканальваючы сваю вытворчую палітыку, укараняючы перспектыўныя распрацоўкі, пашыраючы пералік сваёй прадукцыі, і ўносіць дастойны ўклад у развіццё сельскай і гарадской будоўлі.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2025 г. Кобрынскай раённай цэнтралізаванай цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмай.
Курачук Святлана Дзмітрыеўна,
бібліёграф I кат. аддзела абслугоўвання і інфармацыі.

**Кобринский** сельский строительный комбинат, 1965—2020 : 55 лет / [авторы текста Н. Васюк, Ю. Рубашевский ; фото: Г. Козловского]. - Брест : РИА "Вечерний Брест", 2020. - 56 с.

**ОАО«Кобринский ССК»** // Созданные созидать : [60 лет объединению "Брестоблсельстрой" – Брест, 2020. – С. 125-127 : фот.

**Открытое** акционерное общество «Кобринский ССК» // Мы строим Брестчину. – Брест, 2019. – С. 300 : фат.

**ОАО«Кобринский ССК»** // Полвека на стройке / под общей ред. П. Н. Тишука. - Брест, 2010. – С. 194-196 : фот.

**Белов, Д.** Строят, производят, укрепляют регион : Кобринскому ССК – 60 лет / Дмитрий Белов ; фото из архива Кобринского ССК // Кобрынскі веснік. – 2025. – 28 чэрвеня (№ 26). - С. 6 : фот.

**Белов, Д.** Николай Леонюк: "Работать на своей земле — это счастье" / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2021. — 11 верасня (№ 72). — С. 1 : фот.

За высокие производственные достижения водитель ОАО "Кобринский ССК" Н. А. Леонюк занесен на Доску почета Кобринского района.

**Бакун, Е**. С оптимизмом в будущее / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2019. — 19 чэрвеня. — С. 1 : фот.

Моторист БСУ ОАО "Кобринский ССК" В. Шевелев занесен на Доску почета Кобринского района.

**Белов, Д**. Если строить, то на века! / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2019. — 10 жніўня. — С. 1 : фот.

В канун профессионального праздника — о работе ОАО «Кобринский ССК».

**Отчёт** о финансовых результатах деятельности ОАО "Кобринский ССК" за 2018 год // Кобрынскі веснік. - 2019. — 24 красавіка. — С. 7.

**Отчёт** о финансовых результатах деятельности открытого акционерного общества "Кобринский ССК" за 2017 год // Кобрынскі веснік. - 2018. — 12 мая. — С. 10.

**Бялоў, Д.** Трэба верыць у свае прадпрыемства! / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. — 6 снежня. — С. 1, 2.

Асноўным накірункам дзейнасці ААТ "Кобрынскі СБК" з'яўляецца выпуск і мантаж жалезабетонных вырабаў.

**Бунь, С.** Залог успеха — сплоченный коллектив / [Сергей Бунь ; беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2016. — 11 августа. — С. 2.

Беседа с директором ОАО "Кобринский ССК" Сергеем Бунем.

**Отчёт** о финансовых результатах деятельности открытого акционерного Общества "Кобринский ССК" за 2015 год // Кобрынскі веснік. - 2016. — 26 сакавіка. — С. 9.

**Казакова, А.** ОАО«Кобринский ССК»: анализируя прошлое, строим будущее / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2015. — 13 августа. — С. 3.

**Отчет** о финансовых результатах деятельности открытого акционерного общества "Кобринский ССК" за 2014 год // Кобрынскі веснік. - 2015. — 4 красавіка. — С. 3.

**Муха, Ф.** Работы всегда много / Фёдор Муха // Заря. - 2014. — 3 апреля. — С. 17.

ОАО "Кобринский ССК".

**Отчет** о финансовых результатах деятельности открытого акционерного общества "Кобринский ССК" за 2012 год // Кобрынскі веснік. - 2013. — 27 сакавіка. — С. 4.

**Почёт** и признание // Заря. - 2013. — 4 мая. — С. 4.

Дипломами, овациями и концертной программой наградили в Бресте обладателей звания "Человек года", в том числе и ОАО "Кобринский сельский строительный комбинат" (среди строительных организаций).

**Сідарук, І.** Узвышэнне чалавечнасцю : чалавек і яго справа / Ігар Сідарук ; фота аўтара // Кобрынскі веснік. - 2013. — 22 чэрвеня. — С. 4.

Аб дырэктары ААТ "Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат" Леанідзе Каралюке.

**Федаровіч, І.** Клапотнае - у карыснае / Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2013. — 3 жніўня.— С. 2.

Як ідзе працэс мадэрнізацыі і беражлівасці ў акцыянерным таварыстве "Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат".

**Отчет** о финансовых результатах деятельности открытого акционерного общества "Кобринский ССК" за 2011 год // Кобрынскі веснік. - 2012. - 24 сакавіка. - С. 12.

**Пянко, А.** Диалог о насущном / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2012. - 8 жніўня. - С. 2.

ПМК-16 объединился с коллективом ССК.

**Сідарук, І.** Гарачы месяц жнівень / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2012. - 11 жніўня. - С. 1, 2.

ААТ “Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат” – адна з самых рухомых і высокапрадукцыйных будаўнічых арганізацый раёна.

**Федаровіч, І.** Аптымізму не губляюць / Ігар Федаровіч // Кобрынскі веснік. - 2011. - 30 ліпеня. - С. 3.

Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат.

**Пянко, А.** Универсальный вариант / Алексей Пянко // Кобрынскі веснік. - 2007. - 11красавіка. - С. 2.

Об экономии ресурсов на ОАО "Кобринский ССК".

**Пянко, А.** Вырашаюць людзі / А. Пянко // Кобрынскі веснік. – 1999. – 6 ліпеня (№ 89). – С. 2.

Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат.

**Хільчук, М.** Гаспадыня / Марыя Хільчук // Кобрынскі веснік. – 1998. – 7 кастрычніка. – С. 3.

Калектыў Кобрынскага сельскага будаўнічага камбіната ўзначальвае адзіная жанчына-кіраўнік будаўнічй арганізацыі не толькі ў раёне, але і ў вобласці Л. У. Коўган.

**Славін, Б.** Рэканструкцыя / Б. Славін // Камуністычная праца. – 1986. – 26 чэрвеня.

Міжгаспадарчы сельскі будаўнічы камбінат.

**Амельянюк, І.** Каб збыліся мары / І. Амельянюк // Камуністычная праца. – 1980. – 3 студзеня.

Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат.

**Філіманюк, А.** Поспехі радуюць / А. Філіманюк // Камуністычная праца. – 1980. – 9 жніўня.

Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат.

**Пятроўская, М.** Працоўная перамога / М. Пятроўская // Камуністычная праца. – 1978. – 18 лістапада.

Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат.

**Шаўчук, А.** Вучыцца увесь актыў / А. Шаўчук Камуністычная праца. – 1978. – 5 снежня.

Кобрынскі сельскі будаўнічы камбінат.

***Рэгіён:***

Кобрынскі раён

Кобрын

***Установы:***

Кобрынскі СБК

***Прадметы:***

Будаўнічыя арганізацыі

Прадпрыемствы